23-га лютага — Дзень Узброеных Сіл

Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 5 (827) | Аўторак, 18 лютага 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

# АТРЫМАН АДКАЗ З ГАРСАВЕТА

**У адным з папярэдніх нумароў нашай газеты былі надрукаваны прапановы Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны па сацыяльнай абароне выкладчыкаў і студэнтаў, распрацаваныя прафкомам выкладчыкаў і супрацоўнікаў і прафкомам студэнтаў для разгляду ў пастаяннай камісіі па адукацыі і навуцы гарадскога Савета народных дэпутатаў. Гэтыя прапановы абмяркоўваліся на пасяджэнні гарсавета, якое адбылося 28 студзеня г.г. Днямі ва універсітэт прыйшоў адказ за подпісам старшыні пастаяннай камісіі гарсавета па адукацыі і навукы А. В. Храмцоўскага:**

Разгледзеўшы на пасяджэнні пастаяннай камісіі па адукацыі і навуцы пытанне «Аб сацыяльнай абароненасці работнікаў ВНУ г. Гомеля», камісія адзначае, што ў апошні час умовы жыцця прафесарска-выкладчыцкага саставу вышэйшых навучальных устаноў горада значна пагоршыліся. Стаўкі вядучых работнікаў ВНУ складаюць чатыры студэнцкія стыпендыі. У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС у апошнія гады назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя адтоку навуковых кадраў з г. Гомеля. Так, з ГДУ імя Ф. Скарыны з'ехалі 8 прафесараў; узнікаюць вялікія праблемы з камплектаваннем ВНУ навуковымі кадрамі. Улічваючы, што высокі ўзровень развіцця навукі ў нашай незалежнай дзяржаве Беларусь з'яўляецца залогам працвітання, камісія лічыць неабходным неадкладна вырашыць кола праблем, звязаных з жыццём і дзейнасцю ВНУ г. Гомеля.

**КАМІСІЯ ВЫРАШЫЛА:**

1. Прасіць аблвыканком:

— адшукаць магчымасці даплаты прафесарска-выкладчыцкаму саставу ВНУ горада ў 1992 г.;

— прадаставіць права нечарговага набыцця падпісных выданняў і мастацкай літаратуры работнікам ВНУ;

— прасіць выдзеліць дадаткова ў 1992 г. па 4 аўтамабілі для работнікаў кожнай ВНУ г. Гомеля;

— звярнуць увагу на слабую забяспечанасць фондамі абласной бібліятэкі для навуковых і даследчых работ;

2. Прасіць гарадскі Савет:

— улічваючы вопыт іншых гарадоў Беларусі і дзяржаў СНД прадугледзець у бюджэце 1992 г. даплату да зарплаты прафесараў і дацэнтаў гомельскіх ВНУ ў размеры 300—350 руб. (525 чал.);

— неадкладна пагасіць запазычанасць па выдзяленню жылля ГДУ ў размеры 400 м².;

— больш актыўна ўдзельнічаць у атрыманні работнікамі ВНУ зямельных участкаў;

— разгледзець і прыняць неабходныя меры па зніжэнню кошту за харчаванне ў студэнцкіх сталовых;

— садзейнічаць у будаўніцтве спартыўнай залы для студэнтаў ГДУ;

— адшукаць магчымасці для ўключэння работнікаў ВНУ ў далявы ўдзел будаўніцтва жылля, а таксама павялічыць выдзяленне дзяржаўнай жылплошчы.

**Рашэнне камісіі было абмеркавана на апошнім пасяджэнні прафсаюзнага камітэта. Адзін з яго пунктаў, які датычыцца даплаты да заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага саставу, выклікаў ў большасці членаў прафкома неадназначную ацэнку. Імі была выказана думка, што ва ўмовах вялікага скачка цэн з мэтай сацыяльнай справядлівасці трэба рабіць даплаты не толькі прафесарска-выкладчыцкаму саставу, але і ўсім работнікам універсітэта.**

# НАСТУПЛЕННЕ НА НАШЫ ПРАВЫ І ГАРАНТЫІ

Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, разгледзеўшы паступіўшыя праекты аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс законаў аб працы, выказаў катэгарычную нязгоду з пазіцыяй Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва, накіраванай, па сутнасці, на ліквідацыю правоў і гарантый для працоўных рэспублікі ў галіне працоўных адносін.

У праекце змяненняў Кодэксу законаў аб працы Рэспублікі Беларусь, распрацаваных Камітэтам, выключаны многія сёння дзейнічаючыя нормы і палажэнні, якія абараняюць інтарэсы працоўных.

Так, скасаванне працоўнага дагавору па ініцыятыве наймальніка прапаноўваецца **ажыццяўляць не са згоды, як гэта** было раней, а толькі з улікам думкі прафсаюзнага камітэта. Пры гэтым адмоўная думка прафкома не перашкаджае скасаванню працоўнага дагавора.

**Устанаўленне:**

— форм, сістэм і размераў аплаты працы работнікаў, зацвярджэнне тарыфных ставак і акладаў;

— вызначэнне ўмоў і парадку выплаты ўзнагароджанняў і іншых форм заахвочвання работнікаў;

— тарыфікацыя работ і прысваенне разрадаў працоўным — усе гэтыя пытанні па праекту Дзяржкампрацы рашаюцца наймальнікам самастойна, без усякага ўдзелу працоўных калектываў або іх прадстаўнікоў.

Па праекту прафсаюзы поўнасцю страчваюць права ўдзельнічаць у разглядзе працоўных спрэчак.

Аб наступленні на правы працоўных гаворыць і той факт, што ў раздзеле выключаны ўсе артыкулы, вызначаючыя правы працоўных **і іх паўнамоцных** прадстаўнікоў — **прафесійных саюзаў.**

**Гэта:**

— права на ўдзел у рашэнні пытанняў нарміравання і аплаты працы;

— права кантролю за захаваннем закона аб працы і за выкананнем жыллёвага заканадаўства.

У праекце поўнасцю выключаецца таксама права прафсаюзаў ажыццяўляць нагляд і кантроль за бяспечным вядзеннем работ і **захаваннем норм і правілаў** па ахове працы.

**Усе выкладзеныя факты гавораць аб** тым, што Дзяржкампраца рэспублікі распрацавала антыпрацоўны праект Кодэксу законаў аб працы, пры гэтым кіравалася не інтарэсамі працоўных, а выконвала сацыяльны заказ цяперашніх і будучых прадпрымальнікаў.

На думку прэзідыума Савета ФПБ, такі праект Кодэкса законаў аб працы не павінен быць прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Просім прафсаюзныя камітэты тэрмінова давесці гэтую інфармацыю да ўсіх членаў прафсаюза, выявіць іх меркаванні і зрабіць практычныя крокі па недапушчэнню прыняцця антыпрацоўнага закона. У гэтых мэтах правесці сустрэчы з народнымі дэпутатамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, даць ім наказ не прымаць такі антынародны Закон, накіраваць тэлеграмы пратэсту ва ўрад і Вярхоўны Савет рэспублікі, выказаць нязгоду з пазіцыяй Дзяржкамітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва, накіраванай на ўразанне правоў працоўных.

Прэзідыум Савета Федэрацыі накіраваў **свае прапановы ў Савет Міністраў**, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь і ў камісію Вярхоўнага Савета па пытаннях працы, цэн, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва. Створана група па дапрацоўцы праекта змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс законаў аб працы Рэспублікі Беларусь. Будуць арганізаваны выступленні ў друку, на радыё і тэлебачанні.

**Прэзідыум Савета Федэрацыі.**

## ДАРЭМНА ВЫКЛАДЧЫКІ РАБОЧЫ ЧАС НЕ ТРАЦІЛІ

**У Мінску адбыўся мітынг супрацоўнікаў ВНУ беларускай сталіцы.**

Удзельнікі яго прад'явілі парламенту і ўраду рэспублікі традыцыйны цяпер ультыматум — павышэнне заработной платы і зніжэнне ставак налогаў на прыбытак, у даным выпадку вузаўскай навукі.

Акрамя таго, супрацоўнікі інстытутаў і універсітэтаў патрабавалі выдзеліць ім садовыя ўчасткі ў ваколіцах Мінска. Ну і, зразумела, прыгразілі Саўміну і Вярхоўнаму Савету больш рашучымі мерамі ўздзеяння, не выключаючы і забастоўкі.

(«Народная газета»).

*У прафкоме.*

## ВАСТРЭЙШАЯ ПРАБЛЕМА— ЖЫЛЛЁВАЯ

**У параўнанні з работнікамі вытворчай сферы выкладчыкі і супрацоўнікі ВНУ аказваюцца ў няроўных умовах. Той мізер кватэр, што перападае ВНУ ад дзяржавы, яшчэ доўга не зможа задаволіць іх патрэбу ў добраўпарадкаваным жыллі.**

У нашым універсітэце ў чарзе на атрыманне дзяржаўных кватэр, сфарміраванай у 1990 годзе, стаіць 73 чалавекі з ліку прафесарска - выкладчыцкага саставу. Рухаецца ж яна марудна, бо толькі за апошнія пяць гадоў рашэнне гарвыканкома аб штогадовым выдзяленні жыллёвай плошчы універсітэту не выконвалася, і запазычанасць яму склала звыш 400 м. кв.

А пакуль у бягучым месяцы нашаму універсітэту выдзелены дзве чатырохпакаёвыя і адна двухпакаёвая кватэры ў мікрараёне № 17. На сумесным пасяджэнні прафкома і адміністрацыі, якое адбылося 11 лютага, праходзіла размеркаванне выдзеленага жылля. З інфармацыяй па гэтаму пытанню выступіў старшыня жыллёвай камісіі прафкома П. Д. Грыгарук. Ён нагадаў, што ў адпаведнасці з жыллёвым заканадаўствам нашай рэспублікі, акрамя асноўнай чаргі на добраўпарадкаваныя кватэры можа складацца спіс тых, хто мае права на нечарговае іх атрыманне. Гэта інваліды Вялікай Айчыннай вайны, шматдзетныя сем'і, ліквідатары аварыі на ЧАЭС, хворыя і інш. Есць такія людзі і сярод выкладчыкаў ГДУ. Складзены іх спіс быў зацверджаны сумесным рашэннем прафкома і адміністрацыі. У яго ўвайшлі пяць чалавек: дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі А. У. Сідараў (шматдзетная сям'я), дацэнт кафедры матаналізу У. М. Ермакоў (шматдзетная сям'я), ст. выкладчык кафедры алгебры і геаметрыі А. Д. Хадалевіч (ліквідатар вынікаў аварыі на ЧАЭС), асістэнт кафедры агульнай фізікі В. Д. Крукаў (воін-інтэрнацыяналіст), дацэнт кафедры геаграфіі В. С. Маляравіч (ліквідатар).

На пасяджэнні прафкома чатырохпакаёвыя кватэры выдзелены дацэнтам У. Д. Чартку і А. У. Сідараву, двухпакаёвая — дацэнту Ю. У. Ліхуту.

Разгледжана таксама пытанне аб пастаноўцы ў чаргу на атрыманне жылля яшчэ 13 чал.

